Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# Беларуская хата
(канспект экскурсіі ў міні-музей)

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
1 кваліфікацыйнай катэгорыі

Праграмныя задачы: пазнаёміць дашкольнікаў з сялянскім побытам, асноўнымі рэчамі, іх ужываннем і выкарыстаннем у сялянскай хаце; пашыраць і актывізаваць слоўнік дзяцей за кошт спрадвечна беларускіх слоў і паняццяў, прывіваць любоў да прыгажосці і мудрасці беларускай мовы; выхоўваць беражлівыя адносіны да гістарычнага мінулага роднага краю і Беларусі, каштоўнаснае стаўленне да нацыянальных традыцый.

Абсталяванне: экспанаты этнаграфічнага кутка: макет печы, стол, абрус, збанок, гарлачык, калаўрот, прасніца, верацяно, бойка, ручнікі, кошыкі.

Ход экскурсіі:

Трэба ведаць – сэрца просіць,
Як дзядам, бацькам жылося…
Як сахой даўней аралі,
Як смыком зямлю бярлялі,
Як з сявалкі збожжа-зерне
Рассявалі чорнай жменяй…
Трэба ведаць, што зазналі,
Як на пана працавалі…
Трэба ведаць і пра тое,
Апранали што? Якое?..
П.Броўка

Рабяты, да нас у госці прыйшла дзяўчынка Аленка. Яна запрашае вас на экскурсію ў міні-музей “Беларуская хатка”.

Дзяўчынка. Я хачу пазнаёміць вас з жыццём беларускіх сялян у мінулым, з беларускай хатай.

У хаце ўсе зроблена з дрэва: падлога, столь, сцены, мэбля. Самае галоўнае ў хаце – гэта печ.

Для чаго патрэбна печ?

А што знаходзіцца ў супрацьлеглым ад печы вуглу?

Выхавальнік. Покуць – так называецца гэтае пачэснае месца ў хаце. Уверсе, пад самай столлю, вісяць абразы – з выявамі Ісуса Хрыста і святых.

Прыходзіла свята, Каляды ці Вялікдзень, і на покуці першы садзіўся гаспадар, а злева ад яго астатнія сямейнікі. І ні абы як, а па старшынству, дарослыя і дзеці. Успаміналі добрым словам дзядоў-прадзедаў, частаваліся.

Покуць заўсёды прыгожа ўбіраецца. На абразы гаспадыня вешае ўзорныя ручнікі – набожнікі.

Дзяўчынка. Чым жа любілі займацца нашы продкі?

Выхавальнік. Вечарамі, асабліва ў зімовы час, сялянская хата ператваралася ў майстэрню. У доўгія вечары пры святле лучыны, тут

рабілі лыжкі і посуд, плялі лапці і пралі, ткалі, шылі адзенне і вышывалі.

Адно з самых старажытных промыслаў беларусаў – ткацтва.

На працягу стагоддзяў яно перадавалася з пакаленняў у пакаленне. Сыравінай для ткацтва быў лён або авечая воўна.

У нашым міні-музеі знаходзяцца некаторыя прылады ткацтва: калаўрот, прасніца, верацяно. Ну, і канешне ткацкі станок (калі пража была гатова, то гаспадыні сядалі за станок і пачыналі працу).

Усё рабілі сваімі рукамі, пачынаючы ад саматканай тканіны да ўзораў вышыўкі на ручніках і посцілках.

Ручнікі (паказ экспанатаў) не толькі ўпрыгожвалі інтэр’ер хаты, але і шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх абрадах.

А вось перад вамі – бойка. Калі малако адстойвалася ў збанках, гаспадыня збірала зверху смятану. Назапашвала смятаны ўдосталь і біла з яе ў бойцы масла.

Масла білі ўручную. Калатоўка шпарка бегала зверху-уніз. Бегала доўга і без перадыху, каб смятана ў бойцы не астыла. Збіўшы масла, злівалі ў збанкі маслёнку. Кіславатая, з залацістымі крупінкамі масла, яна смачна сёрбалася потым з цёплай бульбай.

Звярніце, калі ласка, увагу на гліняны посуд. Ён і сёння карыстаецца попытам. Прыгожа глядзіцца ён і на кухоннай паліцы, і на абедзенным стале.

Гэта – збанок . Пасудзіна добра вядомая. У ім звычайна трымалі малако: доўга не скісае, а ў гарачыню – халоднае. Мае ручку і носік-дзюбку, каб тое ж малако лёгка, роўным струменчыкам лілося ў міску ці ў кубак.

Гарлачык – старэйшы за збан. Яны падобныя, як браты, толькі гарлачык без ручкі і не мае носіка-дзюбкі зверху.

У музеі вы бачыце плеценыя кошыкі з лазы.

Падышла да канца наша экскурсія. Ведаць, як жылі нашы дзяды, прадзеды, трэба для таго, каб лягчэй было ісці наперад, у будучыню.

Што новага аб жыцці сваіх продкаў вы даведаліся?

Якія рэчы вам найбольш запомніліся?

Дзякуй за ўвагу!